В.І. Агрэніч,
метадыст аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння
ўстаноў адукацыі сферы культуры ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Спецыфіка арганізацыі і правядзення кваліфікацыйнага экзамену для педагагічных работнікаў дзіцячых школ мастацтваў: ацэнка ўзроўню кваліфікацыі

З мэтай ацэнкі прафесійнага ўзроўню, стымулявання росту прафесійнага майстэрства, развіцця творчай ініцыятывы, павышэння эфектыўнасці і якасці педагагічнай працы ва ўстановах адукацыі ў сферы культуры праводзіцца атэстацыя педагагічных работнікаў (далей — атэстацыя). У Рэспубліцы Беларусь яна праводзіцца рэгулярна, з'яўляецца абавязковай, ахоплівае ўсіх работнікаў, якія займаюцца педагагічнай дзейнасцю, і дакладна рэгламентавана.

У рамках атэстацыі вызначаецца адпаведнасць узроўню кваліфікацыі педагагічных работнікаў патрабаванням, што прад'яўляюцца да пасады і кваліфікацыйнай катэгорыі [1]. Вынікі атэстацыі з'яўляюцца асновай для дыферэнцыяцыі аплаты працы.

Парадак правядзення атэстацыі рэгулюе Інструкцыя аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу), зацверджаная пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. № 101 (са змяненнямі і дапаўненнямі ад 26 сакавіка 2014 г. № 20, 26 лістапада 2014 г. № 163 і ад 20 лістапада 2015 г. № 131) (далей — Інструкцыя) [2].

Пры атэстацыі істотнае значэнне маюць формы кваліфікацыйных выпрабаванняў. Для прысваення і пацвярджэння другой і першай кваліфікацыйных катэгорый праводзіцца атэстацыйная гутарка. Прэтэндэнты на прысваенне або пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі здаюць кваліфікацыйны экзамен, а потым праходзяць атэстацыйную гутарку.

Кваліфікацыйны экзамен — важная і адказная частка працэдуры атэстацыі — з'яўляецца абавязковым. Аднак ёсць і выключэнні з гэтага патрабавання, прадугледжаныя п. 20 і п. 30 Інструкцыі.

Педагагічныя работнікі, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю (дзіцячых школ мастацтваў у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну і народнай творчасці), пры праходжанні атэстацыі на прысваенне або пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі здаюць кваліфікацыйны экзамен у Інбелкульце.

Для правядзення кваліфікацыйнага экзамену ў Інбелкульце ствараюцца кваліфікацыйныя камісіі тэрмінам на адзін год. У іх склад уваходзяць педагагічныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работнікі з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу ўстаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, дадатковай адукацыі.

Склад кваліфікацыйных камісій для правядзення кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі зацвярджаецца загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь, на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі — загадам рэктара Інбелкульта.

Да кваліфікацыйнага экзамену дапускаюцца асобы, якія маюць накіраванне на здачу кваліфікацыйнага экзамену ўстаноў адукацыі ў сферы культуры ці ўпраўленняў (аддзелаў) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Накіраванні на здачу кваліфікацыйнага экзамену ў адрас Інбелкульта высылаюцца штогод да 25 кастрычніка. На іх падставе фарміруюцца групы колькасцю, як правіла, 10—12 чалавек і да 25 лістапада штогод рыхтуецца графік правядзення кваліфікацыйных экзаменаў, які зацвярджаецца рэктарам Інбелкульта.

Кваліфікацыйны экзамен пры праходжанні атэстацыі на прысваенне або пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі педагагічнымі работнікамі дзіцячых школ мастацтваў і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры ў адпаведнасці з Інструкцыяй праводзіцца ў Інбелкульце з чэрвеня 2013 г. У 2013 г. з прэтэндэнтаў на здачу кваліфікацыйнага экзамену на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі былі сфарміраваны 5 груп. У 2014 г. арганізаваны 4 групы з прэтэндэнтаў на прысваенне і 96 груп з прэтэндэнтаў на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

У 2015 г. сфарміраваны 5 груп з прэтэндэнтаў на прысваенне і 18 груп з прэтэндэнтаў на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Усяго на працягу 2013—2015 гг. здалі кваліфікацыйны экзамен 987 чалавек.

Для якаснай арганізацыі кваліфікацыйнага экзамену распрацаваны і зацверджаны Праграма кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі для педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю (дзіцячых школ мастацтваў) у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, народнай творчасці (далей — Праграма кваліфікацыйнага экзамену) і Метадычныя рэкамендацыі аб парадку правядзення кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі для педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю (дзіцячых школ мастацтваў) у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, народнай творчасці (далей — Метадычныя рэкамендацыі) [3].

Інфармацыйныя матэрыялы аб тэматычных і арганізацыйных аспектах кваліфікацыйнага экзамену прадстаўлены на інтэрнэт-сайце Інбелкульта www.inbelkult.by ў раздзеле «Слухачам → Кваліфікацыйны экзамен».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кваліфікацыйны экзамен пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі адбываецца на працягу двух дзён і складаецца з трох раздзелаў: «Педагогіка і псіхалогія», «Метадычная распрацоўка (з вопыту педагагічнай дзейнасці)» і «Творчая праграма».

У першы дзень праводзіцца пісьмовая праца па раздзелу «Педагогіка і псіхалогія». Яна выконваецца па экзаменацыйных білетах, распрацаваных прафесарска-выкладчыцкім саставам кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інбелкульта. У другі дзень, як правіла, — абарона метадычнай распрацоўкі, заснаванай на вопыце педагагічнай дзейнасці, і практычны творчы паказ.

Кваліфікацыйны экзамен пры праходжанні атэстацыі на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі праходзіць на працягу аднаго дня і ўключае абарону метадычнай распрацоўкі (з вопыту педагагічнай дзейнасці).

Метадычныя распрацоўкі педагагічныя работнікі згодна з Метадычнымі рэкамендацыямі падаюць у Інбелкульт за два тыдні да даты правядзення экзамену. Яны павінны быць аформлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі Праграмы кваліфікацыйнага экзамену.

Прыбыццё прэтэндэнтаў на кваліфікацыйны экзамен ажыццяўляецца на падставе ліста-запрашэння.

Па выніках здачы кваліфікацыйнага экзамену прэтэндэнту выдаецца выпіска з пратакола пасяджэння кваліфікацыйнай камісіі адпаведнага ўзору.

Вопыт правядзення кваліфікацыйных экзаменаў дазваляе зрабіць вывад: допуск педагагічных работнікаў да атэстацыі магчымы толькі пры ўмовах:

адпаведнасць атрыманай адукацыі кваліфікацыйным патрабаванням;

наяўнасць стажу працы на адпаведнай пасадзе (акрамя выпадкаў, прадугледжаных п. 19 і п. 20 Інструкцыі);

засваенне зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам.

Згодна з кваліфікацыйнай характарыстыкай настаўніка дзіцячай школы мастацтваў, прадстаўленай у Адзіным кваліфікацыйным даведніку пасад служачых (Выпуск 28: Пасады служачых, занятых у адукацыі), зацверджаным пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 28 красавіка 2001 г. № 53, настаўнік дзіцячай школы мастацтваў павінен мець вышэйшую (сярэднюю спецыяльную) адукацыю па спецыяльнасцях у сферы культуры (профілі «Мастацтва і дызайн», «Гуманітарныя навукі») альбо вышэйшую адукацыю па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» і сярэднюю спецыяльную адукацыю па спецыяльнасцях у сферы культуры (профілі «Мастацтва і дызайн», «Гуманітарныя навукі») або перападрыхтоўку па спецыяльнасцях у сферы культуры (профілі «Мастацтва і дызайн», «Гуманітарныя навукі»); выкладчык павінен мець вышэйшую адукацыю па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» або вышэйшую адукацыю адпаведна профілю выкладаемага вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны) і перападрыхтоўку па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з асноўных задач кваліфікацыйнага экзамену з'яўляецца вызначэнне ўзроўню прафесійнага майстэрства педагагічнага работніка, дасягнутага пасля атрымання папярэдняй катэгорыі. Пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі перыяд працы, які падлягае абагульненню, складае, як правіла, тры гады, пры праходжанні атэстацыі на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі — пяць гадоў.

Згодна з заканадаўствам педагагічныя работнікі ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі павінны праходзіць павышэнне кваліфікацыі па меры неабходнасці, але не менш як адзін раз у тры гады, педагагічныя работнікі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі — не менш як адзін раз у пяць гадоў.

Аднак у выніку аналізу прадастаўленых прэтэндэнтамі на прысваенне або пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дакументаў выяўлена, што шэраг настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў і выкладчыкаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры не маюць педагагічнай адукацыі. У сувязі з гэтым паўстала пытанне аб неабходнасці адкрыцця ва ўстановах дадатковай адукацыі сферы культуры перападрыхтоўкі па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» з прысваеннем кваліфікацыі «Выкладчык у адпаведнасці з кваліфікацыяй па асноўнай адукацыі» [4, с. 245].

Даволі часта накіраванні на здачу кваліфікацыйнага экзамену кіраўнікамі атэстацыйных камісій устаноў адукацыі ў сферы культуры выдаюцца педагагічным работнікам, якія не маюць патрэбнага стажу працы (на атрыманне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі — не менш за тры гады працы ў першай кваліфікацыйнай катэгорыі, на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі — не менш за пяць гадоў).

Многія педагагічныя работнікі не праходзяць своечасова павышэнне кваліфікацыі, матывуючы гэта тым, што ім не выдаюць накіраванні, нягледзячы на іх просьбы. Гэта сведчыць аб тым, што ва ўстановах адукацыі, якія накіроўваюць педагагічных работнікаў, няма дакладнага механізму адсочвання павышэння кваліфікацыі.

Метадычныя распрацоўкі (з вопыту педагагічнай дзейнасці) не афармляюцца ў адпаведнасці з вызначанымі патрабаваннямі Праграмы кваліфікацыйнага экзамену, часам падаюцца несвоечасова [5].

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на прэзентацыі прэтэндэнтамі на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю вопыту сваёй педагагічнай дзейнасці. Вуснае выкладанне вопыту педагагічнай дзейнасці нярэдка бывае непераканаўчым і павярхоўным.

Некаторыя педагогі, атрымаўшы ліст-запрашэнне, адмаўляюцца ад здачы кваліфікацыйнага экзамену. Напрыклад, у 2013—2014 гг. з'явіліся на здачу кваліфікацыйнага экзамену толькі 60 % прэтэндэнтаў ад колькасці запрошаных.

Усё гэта сведчыць аб тым, што педагогі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры, як і іх кіраўнікі, слаба ведаюць нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць атэстацыю педагагічных работнікаў. У сувязі з гэтым Інбелкультам праводзяцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэматычныя семінары па пытаннях атэстацыі педагагічных работнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры.

З мэтай аказання метадычнай дапамогі прэтэндэнтам на здачу кваліфікацыйнага экзамену, іх якаснай падрыхтоўкі арганізуюцца навучальныя курсы па тэме «Прафесійныя кампетэнцыі педагагічных работнікаў: псіхолага-педагагічны аспект». Вучэбная праграма курсаў уключае разгляд пытанняў па раздзелу «Педагогіка і псіхалогія» праграмы кваліфікацыйнага экзамену.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Адзіны кваліфікацыйны даведнік пасад служачых. Выпуск 28: Пасады служачых, занятых у адукацыі: пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, 28.04.2001 № 53 (ред. от 18.07.2012 № 81) // Нац. Реестр правовых актов Респ. Беларусь. 08.08.2012 г. № 8/26229.
2. Інструкцыя аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу): пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 22.08.2012 № 101 (рэд. от 26.03.2014 № 20, ад 26.11.2014 № 163 і ад 20.11.2015 № 131) // Нац. Реестр правовых актов Респ. Беларусь. 16.12.2015 г. № 8/30456.
3. Метадычныя рэкамендацыі аб парадку правядзення кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі педагагічным работнікам, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю (дзіцячых школ мастацтваў) у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, народнай творчасці. ДУА «Інстытут культуры Беларусі», Мінск, 28.09.2015.
4. *Огренич*, *В*. К вопросу о повышении качества образования: новые подходы к оценке деятельности педагогических работников учреждений образования в сфере культуры / В. Огренич, И. Балуш // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : Нацыянальная культура ў зменлівым свеце : матэрыялы IV Міжнар. завочнай навук.-практ. канф. (Мінск, 24 снежня 2015 г.) / ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; рэдкал.: І.Б. Лапцёнак [і інш.]. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2015. — С. 240—246.
5. Праграма кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі для педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю (дзіцячых школ мастацтваў) у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, народнай творчасці. ДУА «Інстытут культуры Беларусі», Мінск, 28.09.2015.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ